Лабаноўскі Л. В.

# БАЯВЫ ШЛЯХ ГЕНЕРАЛ-МАЁРА АРТЫЛЕРЫІ І. К. ВАРАПАЕВА

Ваенны талент нашага земляка Івана Кірылавіча Варапаева быў бясспрэчным. 26 кастрычніка 1944 г. яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Тады ён камандаваў артылерыяй 4-га гвардзейскага стралковага корпуса.

Шлях да славы героя быў цярністым і няпростым.

У 1927 г. Івана Кірылавіча прызвалі на службу ў рады Чырвонай Арміі. У 1929 г. ён стаў членам партыі. Пасля заканчэння ваеннага вучылішча яму прысвоілі званне камандзіра-артылерыста. А калі ў 1934 г. ён закончыў Акадэмічныя курсы ўдасканалення камсаставу, зразумеў, што гэта яго прызванне.

Рабіў усё, што ад яго залежала, каб навучыць чырвонаармейцаў, якія праходзілі службу ў яго падраздзяленні, найлепшым чынам. І ў мірныя дні, у 1936 г., за поспехі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы батарэі, якой ён камандаваў, яго ўзнагароджваюць ордэнам Чырвонай Зоркі.

...Гэты год асабліва запомніўся Варапаеву. З газетных старонак не сыходзіла слова "Іспанія". Тут, на Пірэнейскім паўвостраве, 18 ліпеня 1936 г. супраць Іспанскай Рэспублікі ўзнялі мяцеж фашысцкія генералы.

У Іспанію адпраўляліся сотні савецкіх добраахвотнікаў. Сярод тых, хто вырашыў аказаць дапамогу іспанскаму народу ў барацьбе з фашызмам, быў і 32-гадовы старшы лейтэнант Іван Варапаеў. Ён прыбыўу Картагену летам 1937 г. пад прозвішчам Віслаеў.

Рэспубліканцы аказвалі магутны адпор мяцежнікам. Як толькі мяцеж пачаў выдыхацца, Мусаліні і Гітлер узмацнілі дапамогу франкістам зброяй і тэхнікай, а затым перайшлі да прамога ўзброенага ўмяшання ў справы Іспаніі. Да пачатку 1937 г. супраць рэспублікі на баку Франка ўжо змагаліся 60 тысяч італьянцаў і 10 тысяч немцаў, узброеных навейшай тэхнікай. Пазней іх колькасць павялічылася да 200 тысяч. Іспанія для іх фактычна ператварылася ў выпрабавальны палігон, на якім правяралі ўзоры новай зброі для Другой сусветнай вайны. Рэспубліканцы ўступалі ў артылерыі. Ды і вопыту вядзення бою з яе прымяненнем не было.

У штабе вырашана было накіраваць Варапаева-Віслаева інструктарам артылерыі ў рэспубліканскую армію. Там Іван Кірылавіч

праявіў сябе мужным і смелым чалавекам. Ён ваяваў на Арагонскім фронце і пад Мадрыдам. Савецкі ўрад адзначыў яго інтэрнацыянальны подзвіг баявым ордэнам Чырвонага Сцяга.

А затым было вяртанне на Радзіму. У 1939 г. на пасадзе камандзіра артылерыйскага палка ўдзельнічаў ён у вызваленні заходніх абласцей Беларусі.

...З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Іван Кірылавіч на фронце. Ён паспытаў і горыч адступлення, і радасць перамогі. Варапаеў камандаваў 84-м артылерыйскім палком 55-й стралковай дывізіі, якая да вайны стаяла ў горадзе Слуцк Мінскай вобласці. Прыйшлося ўступаць у бой з ходу. Ён удзельнічаў у баях пад Брэстам і Гомелем, граміў танкавыя часці гітлераўскага генерала Гудэрыяна пад Мсціславам і Крычавам. Яго полк удзельнічаў у абароне Чэрыкава і Краснаполля, у абарончых баях на Сожы, дзе ў ліпені-жніўні 1941 г. было прыпынена наступленне фашыстаў.

Пазней Варапаеў камандаваў артылерыяй 4-га гвардзейскага стралковага корпуса. Ён паказваў узоры гераізму і мужнасці ў справе арганізацыі і ўмелага кіравання артылерыяй.

Іван Кірыпавіч у самыя напружаньм моманты заўсёды знаходзіўся ў баявых парадках і асабіста вёў байцоў на ворага.

Ён ваяваў на Заходнім, Паўднёва-Заходнім, 3-м Украінскім, 1-м Беларускім франтах, прымаў удзел у Сталінградскай, Курскай бітвах, вызваленні Украіны, Беларусі, Полышчы, баях у Германіі.

І. К. Варапаеў вызначыўся пры фарсіраванні Віслы ў жніўні 1944 г., артылерыйскім агнём забяспечыў прыкрыццё савецкіх войск пры пераправе.

Вось што напісаў ва ўзнагародным лісце, прадстаўляючы Варапаева да звання Героя Савецкага Саюза, камандуючы артылерыяй 8-й гвардзейскай арміі гвардыі генерал-лейтэнант артылерыі Пажарскі:

"18 ліпеня 1944 года тав. Варапаеў пасля стараннай падрыхтоўкі змог масіраваным артылерыйскім агнём прарваць моцную абарону (у інжынерньх адносінах) праціўніка ў раёне Ковеля і развіў поспех наступаючай пяхоце.

У перыяд прасоўвання пяхоты ад Ковеля да р. Віслы знаходзіўся ўвес час уперадзе (у баявых парадках) і асабістым прыкладам натхняў і вёў часці наперад, на праціўніка, які супраціўляўся".

З 8 жніўня 1944 г. у баях за расшырэнне плацдарма на левым беразе Віслы, у перыяд злосных контратак пяхоты і танкаў праціўніка, ён змог арганізаваць моцную абарону, асабіста кіраваў адбіваннем контратак. Усе контратакі немцаў былі паспяхова адбіты.

Толькі за адзін месяц, з 20-х чыслаў ліпеня па 22 жніўня 1944 г., артылерыя корпуса, якой кіраваў Іван Кірылавіч Варапаеў, знішчыла 1100 салдат і афіцэраў праціўніка, 103 танкі і самаходныя гарматы, 172 гарматы і мінамёты.

Баявы шлях гвардыі генерал-маёр артылерыі І. К. Варапаеў закончыў у Берліне.

Заслуга Івана Кірылавіча перад краінай і народам высока ацэнена. Яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, ён узнагароджаны ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Суворава 2-й ступені, ордэнам Багдана Хмяльніцкага, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і медалямі.

...Апошні перыяд яго жыцця быў звязаны з Каломнай. У 1946 г. яго прызначылі намеснікам начальніка вышэйшай афіцэрскай школы ў Каломне. Затым – непрацяглая служба ў Адэскай ваеннай акрузе. У 1950 г. генерала Варапаева па хваробе звольнілі з радоў Савецкай Арміі. Ён вярнуўся ў Каломну, дзе жыла яго сям'я.

11 лістапада 1959 г. І. К. Варапаеў памёр. Пахаваны на ваенных могілках у Каломне. На магіле ад Міністэрства абароны СССР яму ўстаноўлены помнік.

Бюст Івана Кірылавіча Варапаева можна пабачыць у Мемарыяльным парку на Алеі Герояў. Ля ўваходу надпіс: "Іх імёны будуць жыць вечна ў сэрцах удзячных патомкаў".

На роднай Краснапольшчыне імя І. К. Варапаева ўвекавечана ў назве адной з вуліц райцэнтра.

**Лабаноўскі, Л. В. Баявы шлях генерал-маёра артылерыі І. К. Варапаева / Л. В. Лабаноўскі // Землякі : гісторыя Краснапольшчыны ў асобах / Л. В. Лабаноўскі. — Мазыр, 2004 .— С. 144—146.**